

Ігар Петрышэнка ўзнагароджвае Вольгу Антоненка.

# Узнагароды і падзякі

**Напрыканцы калегіі адбылося ўзнагароджанне работнікаў культуры па выніках іх дзейнасці за 2019 год. Узнагароды Урада краіны ўручыў намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Ігар Петрышэнка. Пастанову і распараджэнне падпісаў Прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Румас.**

За шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні і папулярызацыі нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны, значны ўклад у развіццё музейнай справы Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь узнагароджаная ўстанова “Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь”.

За шматгадовую плённую працу ў дзяржаўных органах, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў Падзяка Прэм'ер-міністра аб'яўленая **Скарыне Алегу Аляксандравічу**, намесніку начальніка ўпраўлення культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры.



Юрый Бондар віншуе Аляксандра Вавілава.

За шматгадовую плённую працу, значны ўклад у развіццё міжнацыянальных культурных сувязей і папулярызацыю беларускай культуры за мяжой Падзяка Прэм'ер-міністра аб'яўленая **Антоненка Вользе Віталеўне**, дырэктару дзяржаўнай установы культуры змешанага тыпу “Рэспубліканскі цэнтр нацыянальных культур”.

Узнагароды Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь уручыў Міністр культуры Юрый Бондар. За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры і мастацтва, захаванне гісторыка-культурнай спадчыны нагрудным знакам Міністэрства культуры “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” ўзнагароджаныя **Асіпец Аляксандр Уладзіміравіч** — артыст-вакаліст, вядучы майстар сцэны Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь “Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр”; **Вайцянкова Зінаіда Іванаўна** - вядучы эканаміст аддзела фінансавай і кадравай палітыкі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта; **Голуб Нона Яўгенаўна** — кіраўнік планава-эканамічнага аддзела Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”; **Голубева Марта Мікалаеўна** — акцёр тэатра і кіно, член Грамадскага аб'яднання “Беларуская гільдыя акцёраў кіно”; **Гушча Марына Леанідаўна** — загадчык Дома рамёстваў і фальклору Цэнтра традыцыйнай культуры і народнай творчасці Гарадоцкага раёна; **Перышч Святлана Васільеўна** — начальнік аграслужбы Мемарыяльнага комплексу “Брэсцкая крэпасць-герой”; **Рэбкавец Сяргей Рыгоравіч** — дырэктар Дзіцячай школы мастацтваў горада Кобрына; **Северына Ірына Міхайлаўна** — намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце Магілёўскай дзіцячай школы мастацтваў № 1; **Чалык Святлана Аляксандраўна** — начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Клецкага раённага выканаўчага камітэта; **Шалкаплясаў Аляксандр Вячаслававіч** — артыст драмы — вядучы майстар сцэны Заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь “Гродзенскі абласны драматычны тэатр”.

За актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года Падзяка Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь, старшыні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні II Еўрапейскіх гульняў 2019 года ў Рэспубліцы Беларусь аб'яўленая **Вавілаву Аляксандру Дзмітрыевічу** — мастацкаму кіраўніку прадзюсарскага цэнтра “Арт-Мажор” Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; **Гурыновіч Алё Мар'янаўне** — галоўнаму бухгалтару — начальніку аддзела бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Міністэрства культуры; **Дрызе Ірыне Уладзіміраўне** — начальніку галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры; **Карабаню Дзмітрыю Пятровічу** — галоўнаму інжынеру Беларускай дзяржаўнай філармоніі; **Мардусевіч Іне Віктараўне** — кансультанту ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры; **Шаўчуку Аляксандру Сцяпанавічу** — намесніку дырэктара адасобленага структурнага падраздзялення “Белканцэрт” Беларускай дзяржаўнай філармоніі; **Юргенсу Сяргею Антонавічу** — намесніку генеральнага дырэктара Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

Фота Пётры ВАСІЛЕЎСКАГА і Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ